Источник: "Голас Радзімы" - 2012-10-25

# Падарожжа ў мінулае і ў будучыню

Іосіф Маскалёў

## У гісторыі Беларускай чыгункі шмат цікавых старонак

Прэзентацыя саліднага, амаль на тысячу старонак выдання "Гісторыя Беларускай чыгункі. Са стагоддзя XIX у стагоддзе XXI" ладзілася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Кніга нядаўна пабачыла свет у выдавецтве "Мастацкая літаратура", яе падрыхтаваў калектыў беларускіх гісторыкаў і прадстаўнікоў Беларускай чыгункі пад кіраўніцтвам кандыдата гістарычных навук Валянціны Яноўскай.

Можна без перабольшванняў сказаць: рассяленне нашых суайчыннікаў па ўсім свеце значна паскорылася, калі ў былой Расійскай імперыі шпаркімі тэмпамі пачалі будавацца чыгункі. Даўно пралеглі сталёвыя магістралі і па тэрыторыі Беларусі. У кнізе шмат звестак пра тое, як стваралася чыгуначная сетка, як яна працавала ў пару ваенна-палітычных канфліктаў, у міжваенны час. Можна даведацца, як мадэрнізавалася чыгунка, якой яна будзе ў бліжэйшай перспектыве. У кнізе шмат ілюстрацый, у тым ліку і ўнікальных, з архіваў Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы.

Цікавай атрымалася і выстава "Беларуская чыгунка: ад мінулага да сучаснасці", якую падрыхтавалі да імпрэзы супрацоўнікі бібліятэчнага аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў. Больш за 100 дакументаў з фондаў бібліятэкі распавядаюць пра 150-гадовую гісторыю беларускай стальной магістралі. Сярод іх і рэдкія выданні. Напрыклад, адзін з першых нарысаў пра Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава. Цікава даведацца, што Панцеляймон Панамарэнка, вядомы ў Беларусі грамадскі дзяяч, у свой час закончыў Маскоўскі інстытут інжынераў транспарту, працаваў на чыгунцы. У вайну ён узначальваў Цэнтральны штаб партызанскага руху пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання.

Іосіф Маскалёў. Падарожжа ў мінулае і ў будучыню